Выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

**19 ліпеня 2024 года**

# Да ўвагі будучых аграрыяў

**БДАТУ прымае абітурыентаў-бюджэтнікаў і мэтавікаў па 19 ліпеня.**

У Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце падчас асноўнага мэтавага набору, які прайшоў з 27 чэрвеня па 2 ліпеня, залічылі 105 чалавек, у тым ліку 27 выпускнікоў агракласаў, 18 з іх – з Мінскай вобласці. З 6 па 19 ліпеня аб'яўлены дадатковы набор абітурыентаў-мэтавікаў.

— Дадатковы набор абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў нашым універсітэце складае 132 месцы, каля 30 з іх ужо заняты. У склад прыёмнай камісіі БДАТУ ўваходзяць прадстаўнікі кадравых службаў аграрных арганізацый. Яны гутараць з абітурыентамі і іх бацькамі, тлумачаць перавагі мэтавых дагавораў і тут жа на месцы заключаюць іх, – паведаміла дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі моладзі адказны сакратар прыёмнай камісіі універсітэта Карына Гаркуша.



Паводле яе слоў, сёлета БДАТУ набірае 465 чалавек на бюджэт. Падалі дакументы 420 чалавек, у тым ліку 13 выпускнікоў агракласаў.

— Свабодныя месцы, як бачым, яшчэ маюцца. Самы вялікі конкурс склаўся на спецыяльнасць "Менеджмент" — больш за 3,2 чалавека на месца. З ліку інжынерных на цяперашні момант конкурс склаўся на спецыяльнасці "Ахова працы на вытворчасці" і "Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцей" — 1,2 чалавека на месца, — праінфармавала адказны сакратар прыёмнай камісіі УВА.

Дарэчы, важная перавага БДАТУ у тым, што тут можна здаць унутраныя ўступныя іспыты пры адсутнасці сертыфікатаў ЦЭ/ЦТ. Так, абітурыенты інжынерных спецыяльнасцей пісьмова здаюць матэматыку і фізіку, а паступаючыя на "Аграбізнес" — матэматыку і замежную мову, таксама пісьмова.

— Наш універсітэт адрозніваецца практыка-арыентаванай падрыхтоўкай, магчымасцю ў перыяд навучання прайсці бясплатныя курсы для атрымання вадзіцельскага пасведчання, а таксама воінскую службу ў рэзерве. Мы забяспечваем іншагародніх студэнтаў інтэрнатам на ўвесь перыяд навучання, — дадала Карына Гаркуша.

Нагадаем, што 19 ліпеня БДАТУ прымае дакументы абітурыентаў да 18:00. Уся інфармацыя аб працэдуры заключэння дагавораў аб мэтавай падрыхтоўцы і звесткі аб ходзе прыёму размешчаны на сайце БДАТУ.

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**